# ВАШЫЯ ПРАВЫ

Калі вы **БЫЛІ ЗАТРЫМАНЫ** і будзеце дапытаны, як падазроны.



## Правы, аб якіх дапытваемаму павінны паведаміць да пачатку допыту

### 1. Права на канфідэнцыйную кансультацыю з адвакатам і яго дапамогу падчас допыту

A. Адвакат

- Грамадзянін мае права абраць абаронцу па ўласным меркаванні.
- Калі ў дапытваемага няма ўласнага адваката альбо ён не ў стане прыбыць на допыт, ён можа хадайнічаць аб прызначэнні адваката з калегіі адвакатаў.
- Пры некаторых умовах (абставінах) такая прававая дапамога з'яўляецца бясплатнай, цалкам альбо часткова. Грамадзянін мае права запытаць афіцыйны дакумент, у якім гэтыя ўмовы (абставіны) рэзюмаваны.

B. Папярэдняя канфідэнцыйная кансультацыя

- Да пачатку наступнага допыту дапытваемы мае права на кансультацыю са сваім адвакатам, якая цягнецца не больш за 30 хвілін і павінна адбыцца ў межах 2 гадзін пасля яго звароту да прыватнага альбо прызначанага адваката з калегіі адвакатаў.
- Кансультацыя праводзіцца по тэлефоне альбо па месцы допыту.

C. Юрыдычная дапамога падчас допыту

- Дапытваемы мае права карыстацца дапамогай адваката падчас усіх допытаў. Допыт не можа пачацца без прысутнасці вашага адваката.
- Адвакат павінен забяспечыць:
  - Захаванне праў свайго падабароннага на адмову даваць паказанні і растлумачанні, а таксама права на адмову сведчыць супраць сябе;
  - Паважлівыя адносіны да падабароннага падчас допытаў без ягонага прымушання ці супрацьзаконнага ціску на яго;
  - Паведамленне падабароннага аб ягоных правах, а таксама захаванне прававых нормаў падчас допыту.

Калі на гэтым этапе ў адваката ёсць якія-небудзь заўвагі, ен мае права неадкладна ўнесці іх ў пратакол допыту.
Абаронца можа накіраваць хадайніцтва аб правядзенні канкрэтнага расследавання ці аб апытанні канкрэтнай асобы. Ён можа запрасіць растлумачанне пастаўленных пытанняў. Ён можа прадставіць каментарыі адносна расследавання і допыту. Ён не мае права адказваць замест падабароннага ці перашкаджаць допыту.

- Дапытваемы і яго адвакат маюць права перарваць допыт (толькі аднойчы) для дадатковай канфідэнцыйнай кансультацыі. Аналагічным чынам дапытваемы мае права звярнуцца да свайго адваката за канфідэнцыйнай кансультацыяў падчас допыту пры ўстанаўленні новых фактычных абставінаў. Такая кансультацыя павінна цягнуцца не больш за 15 хвілін.

D. Адмова ад права на канфідэнцыйную кансультацыю з адвакатам

Дапытваемы не абавязаны карыстацца правам канфідэнцыяльнай кансультацыі з абаронцам.
Дапытваемы на свой уласны погляд можа адмовіцца ад гэтага права, сур'ёзна абмеркаваўшы наступствы, калі:

- ён паўналетні;
- падпісаў і ўласнаручна датаваў дакумент, які мае такую юрыдычную сілу;
- па магчымасці, допыт можна запісваць з дапамогай тэхнічных сродкаў. Дадзенае пытанне Вы можаце абмеркаваць са сваім адвакатам.

По дадзеных пытаннях, вы можаце патэлефанаваць да каго-небудзь з калегіі адвакатаў.

E. Пазбаўленне права:

У выключных абставінах альбо наяўнасці неабвержымых довадаў галоўны пракурор ці следчы можа прыняць рашэнне аб пазбаўленні затрыманага права на атрыманне папярэдняй канфідэнцыйнай кансультацыі альбо дапамогі адваката на допыце. Такое рашэнне павінна быць абгрунтаваным .

## 2. Агульнае паведамленне аб парушэннях

- Затрыманы мае права атрымаць інфармацыю аб парушэннях, на падставе якіх ён будзе дапытан.

## 3. Права на адмову ад дачы сведкаў і растлумачанняў

- Дапытваемы не абавязаны сведчыць супраць сябе ні на адным з этапаў допыту.
- Пасля вызначэння асобы дапытваемага ён мае права даваць паказанні і тлумачэнні, адказваць на пытанні альбо захоўваць маўчанне.

## 4. Права затрыманага на паведамленне аб тым, што ён арыштаваны

Затрыманы мае права паведаміць аб сваім затрыманні трэцяй асобе.

Тым не меньш, галоўны пракурор альбо следчы можа адтэрмінаваць ужыванне гэтага права затрыманым на час, неабходны для паўнавартаснага правядзення следчых мерапрыемстваў.

## 5. Медыцынская дапамога

- Затрыманы мае права атрымліваць неабходную медыцынскую дапамогу.
- Затрыманы таксама мае права хадайнічаць аб правядзенні абследавання ў абранага ім доктара. Такое абследаванне праводзіцца за кошт затрыманага.

## 6. Дапамога перакладчыка і права на пераклад

- Калі дапытваемы не разумее мовы або не валодае ёю, у выпадку наяўнасці ў апытванага парушэнняў слыху або маўлення, дапытваемы мае права на дапамогу прысяжнага перакладчыка падчас:
  - канфідэнцыйнай кансультацыі з адвакатам (калі адвакат апытванага не разумее мову або не валодае ёю).
  - допыту.

  Такая дапамога аказваецца бескаштоўна.
- Калі дапытваемы не разумее мову працэсу, ён мае права на пераклад адпаведных фрагментаў еўрапейскага ордэра на арышт на мову, якую ён разумее. Такая дапамога аказваецца бескаштоўна.

## Дадатковыя правы затрыманага на допыце

### 7. Іншыя правы на допыце

Перад пачаткам допыту грамадзяніну паведамляюць пэўныя звесткі. Акрамя кароткага апісання фактычных абставін і паведамлення дапытваемага аб тым, што ён мае права адмовіцца даваць сведкі і растлумачанні, яму павінны паведаміць, што:

— Ён мае права патрабаваць даслоўнага пратакалавання ўсіх запытанных пытанняў і адказаў на іх.
— Ён мае права запрошваць пэўнае расследаванне ці апытанне пэўнай асобы;
— Яго паказанні могуць выкарыстоўвацца ў якасці доказаў, якія прымаюцца судом.
— Дапытваемы мае права карыстацца пад час дапросу дакументамі, якія знаходзяцца ў яго распараджэнні, калі для гэтага не патрабуецца адтэрміноўка дапросу. Падчас ці пасля допыту вы маеце права запытаць аб далучэнні дадзеных дакументаў да адпаведнага пратаколу, ці аб перадачы іх да канцэлярыі суда.

### 8. Фіксацыя допыту з дапамогай тэхнічных сродкаў

— Па магчымасці, апытанне можа фіксавацца з дапамогай тэхнічных сродкаў з мэтай яго маніторынгу..
— Рашэнне па дадзеным пытанні прымае асоба, якая праводзіць апытанне, пракурор або следчы.

### 9. У канцы допыту

У канцы допыту дапытваемаму будзе прадастаўлены пратакол допыту для азнаямлення. Ён таксама мае права папрасіць, каб такі пратакол быў яму зачытаны.

Дапытваемаму прадастаўляецца магчымасць уносіць змены ці ўдакладненні ў дадзеныя ім сведкі.

# ВАШЫЯ ПРАВЫ

Калі вы **БЫЛІ ЗАТРЫМАНЫ** і будзеце дапытаны, як падазроны.



## Тэрмін затрымання

### 1. Звычайна, 48 гадзін

Тэрмін затрымання не можа перавышаць 48 гадзін.

### 2. Следчы

— На працягу 48 гадзін затрыманы будзе вызвалены, або паўстане перад следчым, які вырашыць пакінуць затрыманага пад вартай ці выпішэ ордэр на арышт.

— Следчы, які праводзіць допыт, абавязаны, у першую чаргу, дапытаць затрыманага па дадзенай справе. У працэсе допыту затрыманы мае права на дапамогу з боку свайго адваката. Следчы, які праводзіць допыт, павінен выслухаць заўвагі затрыманага або яго адваката адносна магчымасці выдачы ордара на арышт.

Затрыманы мае магчымасць адмовіцца ад гэтага права, толькі калі ён з'яўляецца паўналетнім.

— Калі следчы, які праводзіць допыт, выпісвае ордар на арышт, затрыманы мае наступныя правы:

- свабодна мець зносіны са сваім адвакатам;
- на працягу пяці дзён пасля выпіскі ордара на арышт паўстаць на судовым слуханні і на ім абскардзіць пастанову аб арышце і зняволенні.;
- Азнаеміцца са сваёй справай за дзень да судовага слухання;
- Калі затрыманаму не быў прадастаўлены вусны пераклад ордэра на арышт, ён мае права запытаць (пісьмовы) пераклад адпаведных урыўкаў з ордэра на арышт, калі вы не размаўляеце або разумець мову стразбіральніцтва. Пераклад ордэра ажыццяўляецца бескаштоўна;
- Атрымаць ад адваката дадатковую інфармацыю аб парадку працэсуальных дзеянняў, маючых адбыцца;
- Паведаміць у консульства сваёй краіны аб сваім зняволенні, калі затрыманы не з'яўляецца грамадзянінам Бельгіі.

**Вы маеце права захаваць дадзенае растлумачэнне вашых правоў.**